12. *Kosman, M.* Szkic do portretu Uczonego // Prusy-Litwa-Krzyżacy / H. Łowmiański, opracował M. Kosman. Warszawa: PIW, 1989. S. 5–33.
13. *Pawlikowska, W.* Z dokonań dydaktyczno-naukowych Zakładu Historii Narodów ZSRR w latach 1949–1990 // Lituano-Slavica Posnaniensia. Studia historica. XIII. 2008. S. 23–35.
14. *Iwanow, M.* Seweryn Wysłouch – założyciel polskiej białorucystyki // Stosunki narodowościowe na terenie wijewodstw wschodnich [Wilno, 1939–40] / S. Wysłouch, red. nauk. M. Iwanow. Warszawa, 2013. S. XV–XXXVI.
15. *Zamojska, D.* "Ta ludność życie mieć Uniwersytet..." Walka o utworzenie Uniwersyteta Stefana Batorego w Wilnie / Dorota Zamojska// Kwartalnik Nauki i Techniki. 2006. R. 51. No 3. S. 7–43.
16. *Bardach, J.* Nauka historii ustroju i prawa w litewskiego w Wilnie w latach 1920–1939 // Lithuania. 1994. No 4. S. 63–76.
17. *Aleksandrowicz, S.* Przedmowa // Dwa doktoraty z Uniwersytetu Stefana Batorego w Wilnie. Poznań: Wyd. Poznańskie, 2005. S. 7–12.
18. Collegium Batorianum Uniwersytet Wileński. T. 626. F. III-352. Materialy Aleksandra Gieysztora. Archiwum Polskiej Akademii Nauk w Warszawie.

**Ляскоў Аляксандр Якаўлевіч**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

## ДАСЛЕДАВАННІ І. А. ЮХО І СТАНАЎЛЕННЕ ГІСТОРЫІ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВА БЕЛАРУСІ ЯК НАВУКІ

Станаўленне гісторыі дзяржавы і права Беларусі, на наш погляд, вылучаецца наступнымі ўзаемазалежнымі асаблівасцямі.

Па-першае, гісторыя дзяржавы і права Беларусі развівалася пераважна як універсітэцкая навука (адпаведныя традыцыі былі закладзены яшчэ заснавальнікамі нацыянальнай гістарыяграфіі М. В. Доўнар-Запольскім і У. І. Пічэтам). Па-другое, гісторыя дзяржавы і права фарміравалася адначасова і як навука, і як вучэбная дысцыпліна (па сутнасці можна казаць пра іх непадзельнае адзінства – "два бакі аднаго медаля"). Па-трэцяе, стварэнне нацыянальнай школы гісторыі дзяржавы і права непарыўна звязана з навуковымі пошукамі доктара юрыдычных навук, прафесара Іосіфа Аляксандравіча Юхо (1921–2004).

Актыўная даследчыцкая дзейнасць І. А. Юхо пачалася з 1952 г., калі ён паступіў у аспірантуру Інстытута філасофіі і права АН БССР. Відавочна, што ўжо ў той час вызначыліся яго навуковыя прыярытэты – вывучаць дзяржаўна-прававыя з'явы, звязаныя з гісторыяй Беларусі.

Ужо ў 1954 г. І. А. Юхо абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму "Устанаўленне Савецкай улады ў Заходняй Беларусі ў 1939 годзе". З 1954 па 1956 гг. ён працаваў у акадэмічным Інстытуце філасофіі і права. З 1956 г. – на

юрыдычным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, дзе на працягу розных гадоў займаўся навуковай, педагагічнай і адміністрацыйнай дзейнасцю.

У 1958 г. І. А. Юхо публікуе ў часопісе “Беларусь” артыкул “Хто складаў Літоўскі Статут?” [5]. Пачынаючы з гэтай публікацыі, прасочваецца яго асаблівы інтарэс да вывучэння помнікаў права XVI ст., а таксама схільнасць да папулярызацыі сваіх навуковых пошукаў, што будзе ўласціва яму на працягу ўсяго жыцця.

З 1963 г. пачынае чытаць курс “Гісторыя дзяржавы і права БССР”. У 1964 г. разам з Б. Я. Бабіцкім выдае праграму гэтага вучэбнага курса [3]. Можна сцвярджаць, што менавіта ў той час і зараджаецца гісторыя дзяржавы і права Беларусі як самастойная навука і як асобная вучэбная дысцыпліна.

У 1960–1970-х гг. мінулага стагоддзя публікуе шэраг важных даследванняў па гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Сярод іх вылучаюцца манаграфія “Правовое положение населения Белоруссии в XVI веке” (1978) [2], артыкулы “Статуты Вялікага Княства Літоўскага” (1966) [8], “Грамадскія і прававыя погляды Скарыны” (1967) [4], “Пра назву “Беларусь” (1968) [9], “Уніі Вялікага Княства Літоўскага з Польшчай” (1972) [10] і іншыя. Відавочна, што гэтыя публікацыі закраналі базавую праблематыку гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Аўтар назапашваў матэрыял для наступнага навуковага абагульнення і сістэматызацыі.

Прызнаннем высокага ўзроўню навуковых дасягненняў І. А. Юхо у гэты перыяд стаў яго ўдзел у падрыхтоўцы падручніка па гісторыі дзяржавы і права СССР, для якога ён напісаў артыкул, прысвечаны грамадска-палітычнаму ладу і праву Вялікага Княства Літоўскага (1967) [1].

У 1980 г. І. А. Юхо абараніў у Кіеўскім дзяржаўным універсітэце доктарскую дысертацыю на тэму “Грамадска-палітычны лад і права Беларусі ў XVI ст.”. Ён становіцца адным з найбольш аўтарытэтных спецыялістаў у вобласці вывучэння беларускіх помнікаў права эпохі Рэнесансу. У 1983 г. І. А. Юхо было прысвоена вучонае званне прафесара.

Вельмі плённымі для яго даследчыцкай дзейнасці сталі 1980–1990-я гады, калі, з аднаго боку, аслаблі абцугі афіцыйнай цэнзуры, а з іншага – значна вырас інтарэс грамадства да нацыянальнай гісторыі.

Знакавай падзеяй для станаўлення навукі гісторыі дзяржавы і права Беларусі стала здзейсненае па ініцыятыве І. А. Юхо юбілейнае выданне Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 года з каментарыямі, прымеркаванае да 400-годдзя з даты яго прыняцця. Трэба адзначыць, што і ў далейшым прафесар надаваў асаблівую ўвагу вывучэнню і публікацыі першакрыніц беларускага права.

У 1991 г. ім была выдадзена манаграфія “Крыніцы беларуска-літоўскага права” [7].

У 1992 г. выходзіць этапнае выданне – канцэптуальны вучэбны дапаможнік “Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі” [6], магчыма, адно з найбольш значных дасягненняў І. А. Юхо за ўвесь перыяд яго творчай дзейнасці. У гэтым дапаможніку ўпершыню ў сістэматызаваным (але

лаканічным) выглядзе і ў лагічнай паслядоўнасці былі прадстаўлены яго важнейшыя навуковыя ідэі і падыходы, метадалагічная аснова даследвання, лексічны апарат, а таксама комплекс актуальнага матэрыялу па галоўных праблемах гісторыі дзяржавы і права Беларусі як навукі і як вучэбнай дысцыпліны. Публікацыя “Кароткага нарысу гісторыі дзяржавы і права Беларусі” падвяла пэўныя вынікі шматгадовай дзейнасці І. А. Юхо, прадэманстравала высокі ўзровень яго навуковых асэнсаванняў і абагульненняў, стала трывалай асновай для далейшых творчых пошукаў.

У наступныя гады І. А. Юхо, развіваючы базавыя палажэнні сваіх даследванняў, падрыхтаваў шэраг вучэбных дапаможнікаў і вучэбных праграм па гісторыі дзяржавы і права Беларусі (як правіла, у суаўтарстве), апублікаваў значную колькасць навуковых артыкулаў наватарскага зместу.

Асобна трэба адзначыць яго ўдзел у складанні энцыклапедычных выданняў, для якіх ён у розныя гады напісаў больш за 150 артыкулаў. І. А. Юхо падрыхтаваў двух дактароў юрыдычных навук, дзевяць кандыдатаў юрыдычных навук і аднаго кандыдата філасофскіх навук.

Можна сцвярджаць, што ён сфарміраваў парадыгмальныя асновы навукі гісторыі дзяржавы і права Беларусі, стварыў эфектыўную мадэль вывучэння дзяржаўна-прававых з’яў у кантэксце наратыву беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці.

Прафесар прапанаваў канцэптуальныя падыходы да вызначэння храналагічных, тэрытарыяльных, этнаграфічных, сацыякультурных, крыніцазнаўчых, гістарыяграфічных і іншых аспектаў даследвання гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Абагульніў і сістэматызаваў багаты практычны і тэарэтычны матэрыял. Прааналізаваў шматлікія гістарычныя падзеі і факты, палажэнні важнейшых помнікаў права. Вызначыў перыядызацыю, асноўную праблематыку, тэматыку і навуковую тэрміналогію гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Выявіў сацыяльна-эканамічныя дэтэрмінанты, прычынна-следчыя сувязі, галоўныя тэндэнцыі і заканамернасці ў развіцці нацыянальнага права і беларускай дзяржаўнасці.

Навуковыя дасягненні І. А. Юхо прызнаныя і запатрабаваныя яго паслядоўнікамі і калегамі. Яго работы атрымалі шырокую вядомасць не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Многія ідэі прафесара творча асэнсоўваюцца і развіваюцца сучаснымі аўтарамі.

У той жа час трэба прызнаць, што перад навукай гісторыі дзяржавы і права Беларусі стаяць новыя выклікі, на якія навуковай супольнасці трэба даваць адэкватныя адказы. Назавем некаторыя з іх.

Так, чакае свайго вырашэння праблема далейшага ўдасканалення метадалогіі навуковага даследвання. Неабходным становіцца пошук новых метадалагічных падыходаў і ўдакладненне традыцыйных.

Актуальная задача – арганічнае ўключэнне гісторыі дзяржавы і права Беларусі ў агульнаеўрапейскі кантэкст, што дазволіць не толькі ўспрымаць многія з’явы і падзеі больш аб’ёмна, “стэрэаскапічна”, але і дапаможа пазбегнуць ізаляванасці і “замкнёнасці” нацыянальнай навукі. Важна да-

пускаць магчымасць крытычнага пераасэнсавання шэрагу навуковых пастулатаў з пазіцый аб'ектыўнасці і непрадузятасці, а таксама вылучэння новых неардынарных ідэй і гіпотэз.

Такія падыходы, на наш погляд, будуць у значнай меры спрыяць якасным зменам у развіцці навукі гісторыі дзяржавы і права Беларусі на сучасным этапе.

**Бібліяграфічны спіс**


1. *Юхо, И. А.* Общественно-политический строй и право Литовского государства (XIII–XVI вв.) // История государства и права СССР: учеб. для студентов юрид. вузов и фак. / МГУ им. М. В. Ломоносова; К. А. Сафроненко (отв. ред.) [и др.]. М.: Юрид. лит., 1967. Ч. 1, гл. 10. С. 238–265.
2. *Юхо, И. А.* Правовое положение населения Белоруссии в XVI веке. Минск: Изд-во БГУ им. В. И. Ленина, 1978. 144 с.
3. *Юхо, И. А.* Программа по истории государства и права БССР / И. А. Юхо, Б. Е. Бабицкий. Минск: Выш. шк., 1964. 17 с.
4. *Юхо, І.* Грамадскія і прававыя погляды Скарыны // Полымя. 1967. № 6. С. 175–180.
5. *Юхо, І.* Хто складаў Літоўскі Статут // Беларусь. 1966. № 5. С. 28.
6. *Юхо, Я. А.* Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі: вучэб. дапам. Мінск: Універсітэцкае, 1992. 270 с.
7. *Юхо, Я. А.* Крыніцы беларуска-літоўскага права / Пад рэд. Т. Ф. Есіпенкі. Мінск: Беларусь, 1991. 238 с.
8. *Юхо, Я. А.* Статуты Вялікага Княства Літоўскага // Полымя. 1966. № 11. С. 125–137.
9. *Юхо, Я.* Пра назву "Беларусь" // Полымя. 1968. № 1. С. 175–182.
10. *Юхо, Я.* Уніі Вялікага Княства Літоўскага з Польшчай // Полымя. 1972. № 1. С. 207–226.



**Мазарчук Дмитрий Валерьевич**
*Академия управления при Президенте Республики Беларусь*
*(Минск, Беларусь)*


## ИНТЕЛЛЕКТУАЛЬНАЯ СРЕДА ПАДУАНСКОГО УНИВЕРСИТЕТА И НАЧАЛО РЕФОРМАТОРСКОГО ДВИЖЕНИЯ (НА ПРИМЕРЕ БИОГРАФИИ РЕДЖИНАЛЬДА ПОУЛА)

2017 год представляет нам по меньшей мере две возможности для рефлексии над связью между прошлым и настоящим. Для всего мира это год Реформации, для Беларуси это – «год Скорины». Два события – широкое общеевропейское религиозное движение и начало книгопечатания в Восточной Европе – несомненно, имеют глубинную связь. Обновление менталитета евро-